**Анатацыя**

да дыпломнай працы

**"Прагматыка і сімволіка чыннікаў арніталагічнага кода фальклору Берасцейшчыны"**

студэнткі 5 курса спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)"

**Гронскай Вольгі Юр'еўны**


У даследаванні В.Ю. Гронскай вызначыны асноўныя падыходы да вывучэння арніталагічных вобразаў фальклору, раскрыта сутнасць паняццяў "фальклорны вобраз", "фальклорны сімвал", "фальклорны код" у фалькларыстычным, літаратуразнаўчым, культуралагічным, этналінгвістычным, філасофскім аспектах, выяўлены прагматыка і сімволіка арніталагічных вобразаў у фальклоры Берасцейшчыны, а таксама ахарактарызаваны асаблівасці мастацкай інтэрпрэтацыі арнітавобразаў у паэзіі пісьменнікаў Берасцейшчыны ("Ралля суровая", "Прыручэнне вясны", "Поўны келіх", "Паварот на лета" Н. Мацяш; "Выбранае" Я. Янішчыц; "Рамонкавы бераг", "Каханне", "Такое кароткае лета" Р. Баравіковай).

Аўтар працы пры аналізе матэрыялу выкарыстоўвала розныя метады, што дазволіла вызначыць месца арніталагічнага кода ў комплексе архаічных уяўленняў беларусаў, у пэўных фрагментах абрадавай сістэмы і міфалогіі, а таксама ў вуснай паэзіі і творчасці паэтак Берасцейшчыны. Таксама В.Ю Гронская вылучыла на аснове фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу групу арнітавобразаў, якая няўлучана у класіфікацыйную мадэль "чыстыя/нячыстыя" птушкі.

Вынікі дыпломнай працы могуць быць практычна выкарыстаны пры складанні слоўнікаў па беларускай міфалогіі і фальклору, цэласнай рэканструкцыі міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў, а таксама пры вывучэнні курсаў па фалькларыстыцы, беларускай і славянскай міфалогіі, гісторыі беларускай літаратуры, культуры Беларусі, правядзенні круглых сталоў, семінараў, дыспутаў, выхаваўчых мерапрыемстваў экалагічнай накіраванасці.